


# ААТ «Шані-аграпрадукт»:
# НЕ ХЛЕБАМ АДЗІНЫМ

## Чым гаспадарка прываблівае моладзь, і чаму на вёсцы нясумна жыць


Вядучы прадукцыйных работ Эдуард ГОЙКА на будаўніцтве гаража-стаянкі боксавага тыпу.

**Акцэнт на прафесійныя кадры і новыя тэхналогіі, а таксама стварэнне камфортных умоў не толькі для працы, але і для адпачынку — менавіта такі падыход выкарыстоўваецца ў гаспадарцы «Шані-аграпрадукт», якая з'яўляецца адной з вядучых у Пружанскім раёне. Маладых спецыялістаў тут прываблiваюць не толькі дастойнай аплатай працы і магчымасцю атрымаць службовае жыллё, але і шэрагам перспектыў для ўласнага ўдасканалення, сярод якіх, напрыклад, далейшае навучанне па прафесіі. А каб жыццё праходзіла не толькі на працы, гаспадарка аплачвае наведванне спарткомплексаў, культурных мерапрыемстваў, сумесных з калектывам экскурсій ці гульні ў пейнтбол. Аб работніках тут клапоцяцца — упэўніцца ў гэтым можна, зазірнуўшы хаця б на нядаўна пабудаваную гаспадаркай варкаўт-пляцоўку, размешчаную ў аграгарадку Шані.**


Маладыя спецыялісты злева направа: аграном Уладзіслаў ХІЛІМОНЧЫК, кіроўцы Глеб ГАРДЗЯЙЧУК і Раман ТРУС, аграном Яна АНГУР.

## Галоўнае — прафесіяналы

Асноўны кірунак ААТ «Шані-аграпрадукт» — мяса-малочная вытворчасць. На дзевяці жывёлагадоўчых аб'ектах утрымліваецца 8076 жывёл, з іх 2,5 тысячы дойнага статка. Ад каровы ў суткі тут атрымліваюць да 23,5 літра малака, 96 % здаецца сортам «экстра». Агульная плошча сельгасугоддзяў складае 7,5 тысячы га, з іх 4,5 тысячы га ралля. Гаспадарка спецыялізуецца на вырошчванні цукровых буракоў, зерня, рапсу.

У калектыве 314 работнікаў. Не сакрэт, што ў сельскай гаспадарцы знайсці спецыялістаў на некаторыя пазіцыі часам няпроста. Як адзначае **дырэктар ААТ «Шані-аграпрадукт» Аляксандр ЯКІМОВЕЦ,** прыцягваць кадры дапамагае шэраг мер, замацаваных у тым ліку і ў калектыўным дагаворы. Акрамя матэрыяльнай падтрымкі, куды ўваходзяць выплаты па змене месца жыхарства і пад'ёмныя дапамогі, асаблівая ўвага — забеспячэнню жыллём. Яно маладым спецыялістам даецца без чаргі, аказваецца садзейнічанне ў атрыманні арэнднага, а здымнае цалкам аплачваецца гаспадаркай.

Зусім нядаўна ў якасці падарунка на вяселле службовае жыллё такім чынам атрымаў ветэрынар гаспадаркі — малады спецыяліст, які пасля адпрацоўкі па размеркаванні вырашыў застацца на сваім першым працоўным месцы. Дарэчы, для замацавання спецыялістаў заатэхнічнай і ветэрынарнай службаў у калектыўны дагавор унесена дапаўненне аб тым, што малады спецыяліст пасля заканчэння адпрацоўкі пры падаўжэнні кантракта на максімальны тэрмін атрымлівае аднаразовую матэрыяльную дапамогу ў памеры 200 базавых велічынь, пры заключэнні другога кантракта тэрмінам на пяць гадоў — 300 базавых велічынь.

Летась гэтым правам скарыстаўся і атрымаў дапамогу ў памеры 6400 рублёў малады спецыяліст — начальнік МТК Гарадзечна, сёлета — ветэрынарны фельчар МТК Гарадзечна, які заключыў другі кантракт і атрымаў адназарова 11 тысяч рублёў.

Спрыяе кіраўніцтва сельгаспрадпрыемства і павышэнню прафесійнага ўзроўню работнікаў. Усім ахвотным прапаноўваецца працягнуць навучанне ў ВНУ, а да стыпендыі ім прадугледжаны даплаты ад гаспадаркі. Сёлета ў калектыўны дагавор дадалі новыя пункты. У прыватнасці, сельгаспрадпрыемства аплачвае развіццёвыя курсы і семінары для павышэння прафесійнага ўзроўню.

— Аснова любога прадпрыемства — людзі. Толькі правільна сфарміраваны калектыў рухае прадпрыемства наперад. Няма прафесіяналаў — няма дасягненняў, — упэўнены кіраўнік гаспадаркі.

Аднак важныя і ўмовы працы, у тым ліку абсталяванне і тэхніка. У гаспадарцы і гэтаму ўдзяляюць значную ўвагу. Новая сельскагаспадарчая тэхніка набываецца як за ўласныя сродкі, так і за крэдытныя, і па праграме прамагралізінгу.

— За бягучы год каля васьмі мільёнаў рублёў мы ўклалі ў абнаўленне матэрыяльна-тэхнічнай базы, у асноўным тэхнікі і абсталявання. Напрыклад, для жывёлагадоўчых комплексаў гэтым летам закуплены і змантіраваны сістэмы вентылявання, што стварае камфортныя ўмовы для жывёлы, а гэта ў сваю чаргу ўплывае на колькасць малака. Для таго каб атрымаць пэўны вынік, трэба спачатку ўкласці, — перакананы Аляксандр Якімовец.

## Дынастыя працягваецца

Сярэдняя заработная аплата ў гаспадарцы — больш за 1800 рублёў. Пры гэтым механізатары на ўборцы зерня зарабляюць ад 3,5 да 7 тысяч рублёў.

— Мой падыход такі: сельская праца — цяжкая, а падчас уборачнай — увогуле штодзённая без выхадных — і яна мусіць быць дастойна аплачана, — упэўнены кіраўнік сельгаспрадпрыемства.

І для яго гэта не проста словы. Бацькі Аляксандра Якімоўца ўсё жыццё аддалі сельскай гаспадарцы. Тата Пётр Сямёнавіч Якімовец прысвяціў ёй больш за тры дзесяцігоддзі, трынаццаць апошніх гадоў свайго жыцця ўзначальваў адну з самых паспяховых гаспадарак Брэсцкай вобласці ды, бадай, і краіны — «Агра-Калядзічы», дзе не толькі захаваў, але і прымножыў дасягненні папярэднікаў. Ён заслужаны работнік сельскай гаспадаркі і ўладальнік іншых высокіх прафесійных узнагарод, у тым ліку падзякі Прэзідэнта за ўклад у развіццё сельгасгаліны. А ўсе, каму пашчасціла працаваць побач з ім, называлі яго таленавітым і чалавечным кіраўніком.

— Прыклад бацькоў, якія аддалі жыццё сельскай гаспадарцы, і мяне прымушае рухацца наперад. Любоў да зямлі, любоў да гэтай работы ўзялі верх. Апошнія 13 гадоў я жыў у Брэсце, але сёння я тут. І адчуваю сябе на сваім месцы, — дзеліцца кіраўнік «Шані-аграпрадукт».

У найбліжэйшай перспектыве ў гаспадарцы плануецца будаўніцтва новага жывёлагадоўчага комплексу на 900 галоў, што дазволіць істотна палепшыць умовы ўтрымання жывёлы і павысіць паказчыкі. У планах і далейшае абнаўленне матэрыяльна-тэхнічнай базы, парка тэхнікі, абнаўленне сушыльных комплексаў.

Пры гэтым Аляксандр Якімовец упэўнены, што няважных дробязяў у сельскай гаспадарцы не бывае. Важнае абсалютна ўсё: як працуе кіраўніцтва сельгаспрадпрыемства і кожны работнік на сваім працоўным месцы да таго, як спраўляюцца са сваімі абавязкамі падрадныя арганізацыі. Напрыклад, у гаспадарцы пачалі працаваць з комплексным сэрвісам «Бітрыкс», які дазваляе весці дакументаабарот, планаваць, кантраляваць выкананне задач і аналізаваць вынікі. А для кантролю падрадных арганізацый, якія займаюцца абрэзкай капыт у жывёлы, закуплена адпаведнае абсталяванне, якое дазволіць прааналізаваць эфектыўнасць кожнай маніпуляцыі.

— Сёння любая работа без аналізу — нішто. Мала зрабіць — патрэбны вынік, важна бачыць, наколькі гэта аказалася эфектыўным, — рэзюмуе Аляксандр Якімовец.

## Надвор'е і тэхналогіі не падвялі

Адметных вынікаў сёлета ўдалося дасягнуць у раслінаводстве. Агульны намалот у гаспадарцы сёлета склаў 8547 тон зерня, ураджайнасць — 46,2 ц/га. Гэта, між іншым, на 8,2 цэнтнераў вышэй, чым летась (намалот мінулага года — 7452 тоны, ураджайнасць — 38 ц/га).

Таксама гаспадарка вырошчвае азімы рапс, сёлета ён займаў 400 га. Атрымаць удалося 1825 тон пры ўраджайнасці 45,6 ц/га — яна аказалася на 16,5 цэнтнераў вышэйшай, чым летась.

— Для гаспадаркі гэта дастаткова высокі ўзровень ураджайнасці. Сем гадоў таму, калі я прыйшла ў гаспадарку, ураджайнасць рапсу была на ўзроўні 15-16 ц/га, — кажа **галоўны аграном ААТ «Шані-аграпрадукт» Таццяна НАДЖАФАВА.** — З прыходам новага кіраўніка за кошт таго, што змяніліся падыходы да эканомікі кіравання, больш рэсурсаў укладаецца і ў раслінаводства, бо без гэтага не атрымаеш прадукцыю жывёлагадоўлі. Было шмат зроблена, у прыватнасці, дабаўлена мінеральных угнаенняў, мікраўгнаенняў, перагледжана сістэма аховы раслін. У выніку мы ўбачылі рост ураджайнасці. Па рапсе летась яна складала 29,1 ц/га, сёлета больш за 45 — гэта істотны рост.

Акрамя зерневай групы, кукурузы і рапсу, у гаспадарцы вырошчваюць і цукровыя буракі. Нягледзячы на тое, што і гэтая культура ў многім залежыць ад надвор'я, Таццяна Наджафава мяркуе, што ўраджайнасць будзе не ніжэйшай за ўзровень мінулага года — каля 578 ц/га, а магчыма, і вышэйшай. Цукровыя буракі сельгаспрадпрыемства пастаўляе на Жабінкаўскі цукровы завод.

— Ураджайнасць цукровых буракоў за апошнія дзесяць гадоў таксама вырасла амаль на 300 цэнтнераў. Тут многае залежыць ад тэхналогіі вырошчвання, прымянення новых сродкаў аховы раслін, неабходнага аб'ёму мінеральных угнаенняў, — кажа галоўны аграном гаспадаркі.

Таццяна Наджафава, дарэчы, мае вялікі досвед у вырошчванні гэтай культуры. Першыя веды і навыкі яна атрымала ў гаспадарцы «Белавежскае» Камянецкага раёна, дзе пачынала памочнікам брыгадзіра і дайшла да намесніка генеральнага дырэктара па раслінаводстве. Павышала прафесійны ўзровень і на шматлікіх семінарах, у тым ліку і за межамі краіны.





Механізатар Андрэй МАКАРЭВІЧ і кіроўца Аляксандр ШЫРМА праводзяць сяўбу азімага жыта на зялёны корм.



## Амбіцыйныя планы ў будаўніцтве

Рэканструкцыя і новае будаўніцтва ў гаспадарцы — працэс няспынны. Сёння тут вядзецца будаўніцтва гаража-стаянкі боксавага тыпу для захоўвання зерневых культур у аграгарадку Шані. Аб'ект ужо на фінальнай стадыі — засталося завяршыць падлогі і некаторыя мантажныя работы.

У гэтым жа населеным пункце сёлета праведзена маштабная рэканструкцыя запраўкі. Выкананы рамонт фасаду, агароджвання, пабудаваны вялікі навес. Цяпер будуецца пункт мыйкі для гаспадарчай тэхнікі.

— Шмат сёлета зроблена і на малочных фермах: забетанаваны выгулы, пабудаваны вялікі накапляльнік на комплексе ў Шанях для грубага захоўвання арганікі пад вываз, зроблена агароджанне фермы «Каштанаўка», зроблены частковы рамонт агароджы на комплексе ў Шанях, адрамантаваныя памяшканні на ўсіх малочнатаварных комплексах, — пералічвае **вядучы вытворца работ ААТ «Шані-аграпрадукт» Эдуард ГОЙКА.**

Год таму на малочнатаварным комплексе «Гарадзечна» завершаны будынак закрытага тыпу на 1800 кв. м для камфортнага ўтрымання маладняку. Раней цяляты знаходзіліся ў дамках на вуліцы. У найбліжэйшы час плануецца будаўніцтва сучаснага малочнатаварнага комплексу на 900 галоў, цяпер ідзе яго праектаванне.


Спецыяліст па ідэалагічнай рабоце Хрысціна АСІПЧУК на дзіцячай пляцоўцы, пабудаванай прадпрыемствам для жыхароў аграгарадка



## Дарогу — моладзі

Аб'ект, які нязвыкла ўбачыць у аграгарадку, — пляцоўка для дзяцей і дарослых з горкамі і вулічнымі трэнажорамі.

— Раней у нас не было ні сквера, ні парку для кантактавання моладзі, ды і дарослых. Узнікла ідэя з пляцоўкай для дзяцей, аднак адразу прынялі рашэнне, што будзем будаваць і для дарослых — такая ж варкаўт-пляцоўка маецца ў Пружанах, — расказвае **спецыяліст па ідэалагічнай рабоце ААТ «Шані-аграпрадукт» Хрысціна АСІПЧУК.** — Месца абрана побач са школай, дзе сёння вучыцца 70 дзяцей. Там цяпер створаны гурткі, падлеткі прыходзяць займацца на трэнажорах. Побач устаноўлены дыджытал-экран, на якім дэманструюць мультфільмы і сацыяльныя ролікі. Здымаем і свае ролікі аб палявых работах, нарыхтоўцы кармоў, «Дажынках». Другі экран маецца побач з адміністрацыйным будынкам. Людзям прыемна ўбачыць сябе на экране, — дзеліцца спецыяліст.

Сапраўдным святам стала і адкрыццё пляцоўкі. Дзеці бавілі час з аніматарамі, на надзіманых батутах, тарзанцы, а дарослых чакаў канцэрт. Мерапрыемства было цалкам аплачана гаспадаркай.

Асобны клопат сельгаспрадпрыемства — моладзь. Маладых людзей ва ўзросце да 31 года ў калектыве каля шасці дзясяткаў.

— Праводзім тое, што цікава самім работнікам. У нас ёсць адмысловы чат, дзе абмяркоўваем тыя ж паездкі. Зімой ездзілі гуляць у пейнтбол, раней былі экскурсіі: Хатынь, Дудуткі, Мінск, вялікі парк забаў у Баранавічах «Дыпрыз», выстаўка «Белагра». Сёлета ўдзельнічалі ў раённым турыстычным злёце, — пералічвае Хрысціна Асіпчук.

Шчыльна працуе гаспадарка і з мясцовай школай. Сёлета ўсе старэйшыя школьнікі ў межах студатрада працавалі ў гаспадарцы.

— Адпрацаваўшы 10 дзён у студатрадзе, старшакласнікі захацелі індывідуальна працаўладкавацца і прапрацавалі ўсё лета. У некаторых заробкі даходзілі да тысячы рублёў, усе сабралі сябе да школы, — расказвае спецыяліст па ідэалагічнай рабоце.


Самаходны кормараздатчык, набыты летась.


Працэс размеркавання і трамбоўкі кукурузнай масы на сіласнай траншэі.

## Якасны камбікорм, камфортнае ўтрыманне і сексіраванае семя

Сёння ў ААТ «Шані-аграпрадукт» 8076 жывёл, з іх 2,5 тысячы дойнага статка, 1,5 тысячы бычкоў на адкорме. У суткі ад каровы тут атрымліваюць да 23,5 літра малака, а гэта на 1,26 літра больш, чым летась. З пачатку года сортам «экстра» здадзена 96 % малака, яго тлустасць — 3,8 % .

Самы сучасны ў гаспадарцы — малочнатаварны комплекс замкнёнага цыкла «Гарадзечна», пабудаваны ў 2010 годзе і разлічаны на 1100 галоў. Яго абслугоўвае 30 работнікаў, у тым ліку начальнік комплексу, яго памочнік, селекцыянер, асеменатар, ветэрынарны ўрач, а таксама жывёлаводы і механізатары. Летась быў набыты новы самаходны кормараздатчык, які аблегчыў работу персаналу.

Сёлета тут устаноўлена сістэма вентылявання з арашэннем. Яна стварае мікраклімат у памяшканнях у спякотнае надвор'е. Сістэма арашэння аўтаматычна ўключаецца пры 25 градусах, вентылятары — пры 23.

— Шэсць гадоў таму, калі я прыйшоў працаваць у гаспадарку, надоі складалі 17 літраў у суткі, цяпер удалося дасягнуць 23,5 літра, але і гэта не мяжа, — адзначае **галоўны заатэхнік «Шані-аграпрадукт» Уладзімір АСІПЧУК.** — Шмат залежыць ад работы заатэхнічнай і ветэрынарнай службаў і ад работнікаў на месцах. Важная і селекцыйная работа. Мы прымяняем семя быкоў з племяннай каштоўнасцю вышэй за 130. За пяць гадоў гэта прынесла свой плён. Змяніліся сёння і падыходы ў вытворчасці камбікармоў і іх складніках, утрыманні жывёлы і яе кармленні.

Планавы выхад цялят у гаспадарцы — 84 на 100 галоў. Летась тут пачалі працаваць з сексіраваным семем (семя быкоў-вытворцаў, раздзеленае па поле), якое дазваляе атрымаць толькі цёлачак і значна павялічаць матачнае пагалоўе буйной рагатай жывёлы.

— Дзякуючы такой тэхналогіі з 600 асемянёных цёлак мы атрымалі толькі двух бычкоў. За гэтым — будучыня, — упэўнены галоўны заатэхнік.

Зрэшты, як і за прафесіяналамі. А іх выхоўваюць з маладых спецыялістаў, учарашніх выпускнікоў спецыялізаваных навучальных устаноў. На МТК «Гарадзечна» такіх нямала. Сярод іх і **начальнік комплексу Дзмітрый ЖУК.**


Малады спецыяліст, начальнік малочна-таварнага комплексу «Гарадзечна» Дзмітрый ЖУК.

— Пасля заканчэння Ваўкавыскага дзяржаўнага аграрнага каледжа прыйшоў на адпрацоўку па мэтавым накіраванні, спачатку працаваў намеснікам начальніка комплексу. Чаканні апраўдаліся, бо ўсведамляў, куды іду вучыцца і дзе давядзецца працаваць. Таму пасля заканчэння адпрацоўкі працягнуў кантракт. У кастрычніку мінулага года стаў начальнікам комплексу. Атрымаў службовае жыллё — дом у вёсцы, — дзеліцца Дзмітрый Жук.

**Аграном Яна АНГУР,** выпускніца Гродзенскага дзяржаўнага аграрнага ўніверсітэта, які скончыла год таму, пакуль працуе па размеркаванні. Дзяўчына здымае кватэру ў Пружанах, штодзень транспарт сельгаспадаркі падвозіць работнікаў на работу з райцэнтра.

— Я нарадзілася ў Навагрудку, да ўніверсітэта не была знаёма з сельскай гаспадаркай. Прыйшла па размеркаванні і цяпер працую на ўборцы і закладцы кармоў на зіму. Нягледзячы на тое, што ўборачная ў нас — самы складаны час, у цэлым работа мне падабаецца.

**Алена КРАВЕЦ, Алена ДАЎЖАНОК.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**

УНП 200026194

